# ЛІЧБАВЫЯ АСПЕКТЫ ГАРМАНІЗАЦЫІ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ ДЗЯРЖАЎ — ЧЛЕНАЎ ЕЎРАЗІЙСКАГА ЭКАНАМІЧНАГА САЮЗА Ў ДАЧЫНЕННІ ДА АБ'ЕКТАЎ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ УЛАСНАСЦІ

**Д. А. Белая[1], Л. І. Тарарышкіна[2]**

*[1] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, Мінск, Беларусь, belayaa_1903@mail.ru*
*[2] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, Мінск, Беларусь, tararyshkina@rambler.ru*

Развіццё інтэлектуальнай уласнасці ў Еўразійскім эканамічным саюзе (ЕАЭС) абумоўлівае асноўныя шляхі далейшага супрацоўніцтва ў дадзенай сферы, хутка ды бесперапынна набіраюць абароты інтэграцыйныя працэсы. Таксама паступова гарманізуецца заканадаўства, функцыянуюць наднацыянальныя органы, ажыццяўляецца пастаянны дыялог паміж органамі дзяржаўнай улады, бізнесам і спажыўцамі для дасягнення агульных мэтаў. У артыкуле разглядаецца неабходнасць распрацоўкі ды стварэння адзінай электроннай базы аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, якія ахоўваюцца ў дзяржавах — членах ЕАЭС, з універсальным доступам для любой зацікаўленай асобы. Больш за тое, прапануюцца накірункі ўдасканалення маркіроўкі тавараў з мэтай пазбегнуць выкарыстання нізкаякаснай падробленай прадукцыі і далейшага нанясення шкоды жыццю і здароўю насельніцтва.

***Ключавыя словы:*** Еўразійская эканамічная інтэграцыя; электронны гандаль; інтэлектуальная уласнасць; ідэнтыфікацыя прадуктаў; лічбавізацыя; эканамічная бяспека; тэхналагічныя ўпаковачныя прылады.

# DIGITAL ASPECTS OF HARMONISED INTERACTION BETWEEN EURASIAN ECONOMIC UNION MEMBER STATES IN RELATION TO INTELLECTUAL PROPERTY OBJECTS

**D. A. Belaya[a], L. I. Tararyshkina[b]**

*[a] Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, belayaa_1903@mail.ru*
*[b] Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, tararyshkina@rambler.ru*
*Corresponding author: D. A. Belaya belayaa_1903@mail.ru*

The development of intellectual property in the Eurasian Economic Union determines the main ways of further co-operation in this area, integration processes are rapidly and continuously gaining momentum. Moreover, legislation is gradually being harmonized, supranational bodies are functioning, a constant dialogue between public authorities, business and consumers is carried out in order to achieve common goals.

The article examines the need to elaborate and create a unified electronic database of intellectual property objects protected in the Union member states with universal access for any stakeholder. In addition, the article suggests directions for improving the goods labelling in order to avoid the use of low-quality counterfeit products and further harm to the life and health of the population.

***Keywords:*** Eurasian economic integration; e-commerce; intellectual property; product identification; digitalisation; economic security; technological packaging devices.

З пераходам у лічбавы век ў інтарэсах прагрэсіўнага развіцця наперад выйшлі тэхналогіі, у аснове каторых першапачаткова ляжыць менавіта інтэлектуальная творчая дзейнасць чалавека. Цяперашні этап развіцця сусветнай эканомікі наглядна сцвярджае, што інавацыйны шлях — гарантыя ўстойлівага эканамічнага росту дзяржаў ды інтэграцыйных аб'яднанняў. Інфарматызацыя падчас стварэння вытворчасцяў з высокім дабаўленым коштам спрыяе росту канкурэнтаздольнасці нацыянальных эканомік, а таксама прасоўванню тавараў на замежныя рынкі. Асноўнымі фактарамі, што выклікаюць неабходнасць актывізацыі інтэграцыйнага супрацоўніцтва, сёння лічацца развіццё «эканомікі ведаў» і глабалізацыя рынкаў.

Адным з галоўных фактараў шчаснага функцыянавання дзяржавы выступае як міжнароднае, так і рэгіянальнае супрацоўніцтва, накіраванае на розныя сферы грамадскіх адносін, у тым ліку, абарону інтэлектуальнай уласнасці (далей — ІУ) і супрацьдзеянне кантрабандзе і кантрафакту, таму палажэнні рашэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета ад 11 снежня 2020 г. № 12 «Аб стратэгічных напрамках развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 г.» закранулі і сферу абароны ІУ. Так, згодна з п. 5.5 павінна ажыццяўляцца «лічбавая трансфармацыя ў сферы ІУ ў рамках Саюза» [1]. У адпаведнасці з пп. 5.5.1 — «Стварэнне сэрвісаў, якія дазваляюць ажыццяўляць у рэжыме анлайн пошук інфармацыі аб аб'ектах прамысловай уласнасці, якія ахоўваюцца ў дзяржавах-членах» і пп. 5.5.2 — «Выпрацоўка ў рамках Саюза ўзгодненых падыходаў да барацьбы з парушэннямі правоў на аб'екты ІУ ў інфармацыйна-тэлекамунікацыйнай сетцы Інтэрнэт»; а таксама з пп. 11.7.6 — «Развіццё супрацоўніцтва з Сусветнай арганізацыяй інтэлектуальнай уласнасці (далей — САІУ) у рамках Мемарандума аб узаемаразуменні паміж Еўразійскай эканамічнай камісіяй (далей — ЕЭК) і САІУ ад 7 траўня 2019 г. (абмен інфармацыяй, удзел у мерапрыемствах)». Абарона аб'ектаў ІУ мытнымі органамі ў межах сваёй кампетэнцыі становіцца комплексным пытаннем, якое патрабуе паўнавартаснага ўдасканалення ўзаемадзеяння дзяржаў — членаў ЕАЭС, найбольш актыўнай распрацоўкі рэкамендацый адносна эфектыўнасці барацьбы з распаўсюджваннем кантрафактнай і фальсіфікаванай прадукцыі.

Згодна з Дагаворам аб ЕАЭС, дзяржавы-члены ажыццяўляюць супрацоўніцтва ў сферы ІУ для вырашэння дзвюх галоўных задач:

— гарманізацыі заканадаўства ў сферы абароны правоў на аб'екты ІУ;

— абароны інтарэсаў уладальнікаў правоў на аб'екты ІУ.

Таму, ЕЭК значная ўвага надаецца пытанням падтрымкі навуковага ды інавацыйнага развіцця, забеспячэння эфектыўнай абароны і аховы правоў на аб'екты ІУ, прадастаўлення спрыяльных умоў для ўладальнікаў аўтарскага права і сумежных правоў дзяржаў-членаў, удасканалення механізму камерцыялізацыі і выкарыстання такіх аб'ектаў ІУ. Аснову інтэграцыйнага працэсу, безумоўна, складае нарматыўна-прававая база, якая рэгламентуе сферу развіцця ІУ, якую ў ЕАЭС складаюць «Дагавор аб каардынацыі дзеянняў па абароне правоў на аб'екты ІУ» ад 8 верасня 2015 г., «Пагадненне аб парадку кіравання аўтарскімі і сумежнымі правамі на калектыўнай аснове» ад 11 снежня 2017 г., «Дагавор аб таварных знаках ЕАЭС» ад 3 лютага 2020 г., «Інструкцыя да Дагавора аб таварных знаках, знаках абслугоўвання і НМПТ ЕАЭС» ад 18 мая 2021 г. Рэалізацыя гэтых дакументаў садзейнічае вырашэнню шматлікіх праблем у сферы ІУ і развіццю інвестыцыйнага супрацоўніцтва краін-удзельніц.

Акрамя гэтага, ёсць і іншыя аспекты, якія вызначаюць інтэграцыю ЕАЭС у пытанні ІУ. Адзін з іх — наднацыянальныя органы, што сапраўды функцыянуюць і сведчаць пра шчыльнае супрацоўніцтва. Інстытуты камісіі ў дадзенай сферы прадстаўлены Кансультатыўным камітэтам па ІУ, асноўнымі задачамі каторага выступаюць распрацоўка прапаноў для Калегіі ЕЭК па пытаннях аховы і абароны правоў ІУ, сталая арганізацыя кансультацый з прадстаўнікамі дзяржаў-членаў, правядзенне сумесных форумаў (напрыклад, міжнародны форум «Антыкантрафакт»). Для вызначэння шляхоў далейшага развіцця інтэграцыі 6 снежня 2018 г. у Санкт-Пецярбургу была падпісана Дэкларацыя аб далейшым развіцці інтэграцыйных працэсаў у рамках ЕАЭС, што адлюстравала наступныя ключавыя напрамкі развіцця:

— забеспячэнне максімальнай эфектыўнасці адзінага рынку ЕАЭС і рэалізацыя яго магчымасцяў для бізнесу ды спажыўцоў;

— фарміраванне «тэрыторыі інавацый» і стымуляванне навукова-тэхнічных прарываў;

— раскрыццё патэнцыялу інтэграцыі для людзей, павышэнне іх дабрабыту і якасці жыцця;

— фарміраванне ЕАЭС як аднаго з найбольш значных цэнтраў развіцця сучаснага свету, адкрытага для ўзаемавыгаднага ды раўнапраўнага супрацоўніцтва са знешнімі партнёрамі і выбудоўвання новых фарматаў узаемадзеяння [2].

Менавіта для яе рэалізацыі быў прыняты дакумент, які вызначае Стратэгічныя напрамкі развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 г. (зацверджаны рашэннем Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага

савета № 12, якое змяшчае агульныя палажэнні і пералік мер і механізмаў рэалізацыі стратэгічных напрамкаў, у тым ліку, фарміраванне лічбавай прасторы ЕАЭС, лічбавых інфраструктур і экасістэм) [3].

Для эфектыўнай абароны аб’ектаў ІУ патрэбна пераадоленне цяжкасцяў, сярод каторых вызначаецца адсутнасць паняційнага апарату. Адсутнасць аднастайнай трактоўкі, замацавання на заканадаўчым узроўні тэрмінаў «кантрафакт», «прамысловая прадукцыя», «аўтарскае права», «таварны знак», «фальсіфікаваная прадукцыя», «меры па абароне правоў на аб’екты ІУ», «сумежнае права» выклікае несуразмернасць адказнасці за парушэнні ў сферы ІУ. Не менш значны недахоп — гэта адсутнасць паўнавартаных дадзеных пра аб’ём і характар кантрафактнай прадукцыі. Тут найбольш важным інструментам процідзеяння ўвозу кантрафактнай прадукцыі на мытную тэрыторыю ЕАЭС застаецца ўвядзенне ў дзеянне мытнага рэестру аб’ектаў інтэлектуальнай уласнасці (далей — МРАІУ), які фарміруецца на аснове заяў праваўладальнікаў дзеля абароны іх правоў. Таксама неабходна прыняцце комплексу метадаў рэгулявання рынку ІУ на наднацыянальным узроўні. Праваахоўныя органы краін — удзельніц Саюза павінны дзейнічаць сумесна ды займаць больш жорсткую пазіцыю адносна як вытворцаў, так і пастаўшчыкоў кантрафактнай прадукцыі. Тут найбольш значнымі павінны стаць сферы кантрафактных медыкаментаў і харчовых тавараў, а таксама геаграфія іх паходжання.

Сёння з’явілася сур’ёзная неабходнасць у стварэнні адзінага органа дзяржаў — членаў ЕАЭС, які будзе займацца абаронай ІУ і ў абавязкі якога будуць уваходзіць правядзенне праверак, выданне загадаў аб спыненні вытворчасці або продажу прадукцыі і далейшая канфіскацыя, накладанне штрафаў, ануляванне ліцэнзій на прадпрымальніцкую дзейнасць. Новыя тэхналогіі выклікаюць і цяжкасці (распаўсюджванне трохмернага друку палягчае капіраванне, 3*D*-прынтэры спрыяюць перасоўванню вытворчых памяшканняў, парушальнікі амаль бесперашкодна высылаюць інструкцыі кліентам, якія валодаюць 3*D*-друкаркамі, што дазваляе ім вырабляць кантрафактную прадукцыю самастойна). А вось выдаткі на іх пераслед у большасці выпадкаў перавысяць выгаду ад любога паспяховага іску аб кампенсацыі шкоды, таму патрэбна скаардынавана маніторыць апошнія тэхналагічныя тэндэнцыі.

Больш за тое, пры ўзаемадзеянні дзяржаў-членаў неабходным стане павышэнне дасведчанасці спажыўцоў аб нізкай якасці і патэнцыйнай небяспецы кантрафактных тавараў. Прымяненне разнастайных тэхнічных сродкаў (галаграм, біяметрычных маркераў і чарнілаў, смарт-карт) стане карысным для абароны і аўтэнтыфікацыі сапраўдных прадуктаў. Праз стварэнне агульных для рынку інтэграцыйнага аб’яднання тэхналагічных упаковачных прылад для барацьбы з падробкай будзе даступны пераслед дзвюх мэт: значна спрошчаная ідэнтыфікацыя прадуктаў як арыгінальных і перашкода стварэнню іх копій. Трэба рабіць прадукцыю

больш цяжкай для капіявання праз схаваную маркіроўку (убудоўваць яе ў упакоўку), якую цяжка аднавіць. Так, гэта можна зрабіць шляхам выкарыстання маркераў бяспекі, якія не з'яўляюцца бачнымі пры звычайных умовах (флуарэсцэнтныя чарнілы, што можна распазнаць толькі пры ўздзеянні ультрафіялетавага святла, ды магнітныя пазнакі, прысутнасць каторых можа быць выяўлена толькі ў нізкачастотных магнітных палях). Тады для спажыўцоў неабходна стварыць прыкладанне ў *Play Market* і *App Store*, якое дазволіць праверыць тавар на наяўнасць такіх пазнак яшчэ ў краме. Акрамя таго, прарывы ў тэхналогіі радыёчастотнай ідэнтыфікацыі (*RFID*) прапануюць *RFID*-прылады (напрыклад, бірка ці этыкетка), якія могуць быць убудаваныя ў прадукт, пасля чаго радыёхвалі выкарыстоўваюцца для перадачы дадзеных на счытвальнік, каб ідэнтыфікаваць тавар як сапраўдны, але недахопам стане завышаны кошт такой таварнай адзінкі.

Адным з ключавых напрамкаў інтэграцыі праз фарміраванне лічбавай прасторы выступае «ўдасканаленне сістэмы маркіроўкі і нагляду за таварамі ў рамках ЕАЭС», што выклікана неабходнасцю ўзмацнення жорсткасці барацьбы з кантрафактнай прадукцыяй. Тут трэба згадаць пра «Пагадненне аб механізме нагляду за таварамі, увезенымі на мытную тэрыторыю ЕАЭС», падпісанае 29 мая 2019 г. [4]. Нагляд — гэта сістэма кантролю за рухам тавараў, асноўнымі мэтамі каторай з'яўляюцца:

— рост эфектыўнасці мытнага і падатковага адміністравання;

— скарачэнне аб'ёмаў незаконнага абароту прадукцыі;

— зніжэнне магчымасцяў ухілення ад выплаты падаткаў, пошлін, збораў;

— сцвярджэнне законнасці абароту тавараў, адпаведнасці іх якасці;

— выключэнне шэрых схем, схем аптымізацыі.

Праз выкарыстанне спецыяльных лічбавых сістэм увесь ланцужок перамяшчэння тавару прасочваецца і кантралюецца (ад вытворцы да спажыўца), што робіць мінімальнай магчымасць рэалізацыі нелегальна ўвезенага тавара. Рэспубліка Беларусь ратыфікавала «Пагадненне аб механізме прасочвання тавараў, увезеных на мытную тэрыторыю ЕАЭС» 29 мая 2019 г., для павышэння канкурэнтаздольнасці добрасумленных суб'ектаў знешнеэканамічнай дзейнасці [4]. Прэзідэнт Беларусі 29 снежня 2020 г. падпісаў Указ № 496 «Аб нагляду за таварамі» для рэалізацыі адзначанага вышэй Пагаднення, для стварэння нацыянальнай сістэмы інфармацыйнага нагляду за таварамі, якая прадугледжвае збор, захоўванне, апрацоўку і кантроль дадзеных аб таварах і аперацыях пры іх абароце; рэалізоўваць сістэму плануецца за кошт абавязковага складання электронных накладных на пэўныя групы тавараў (вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, а органам, адказным за вядзенне такой сістэмы прызначана Міністэрства па падатках і зборах) [5]. А вось само ўвядзенне ў абарот электронных накладных вызначана пастановай Савета

Міністраў № 940 [6]. Электронны дакументаабарот ажыццяўляецца і праз інфармацыйныя сістэмы, у тым ліку, сістэмы электроннага абмену дадзенымі (наяўнасць электроннага лічбавага подпісу дае магчымасць стаць яе паўнавартасным карыстальнікам). Сістэма значна эканоміць час на апрацоўку дакументаў і скарачае выдаткі на афармленне дадзеных на папяровым носьбіце, дае мытным, падатковым і іншым органам аддалены доступ да дадзеных, іх праверку ў любы час.

У рамках лічбавай трансфармацыі сферы ІУ выдзелены наступныя меры:

— стварэнне сэрвісаў, праз каторыя ажыццяўляецца анлайн-пошук інфармацыі аб аб'ектах прамысловай уласнасці, што ахоўваюцца ў дзяржавах-членах;

— выпрацоўка ўзгодненых падыходаў да барацьбы з парушэннямі правоў на аб'екты ІУ ў сетцы.

Праз адсутнасць паўнавартаснага функцыянавання адзінага МРАІУ, даволі перспектыўным было б стварэнне адзінай базы дадзеных, якая ўтрымлівала б зводную інфармацыю па абароне аб'ектаў ІУ краін — удзельніц ЕАЭС, стала б пераходам да адзінага МРАІУ.

Такім чынам, для перашкоды пакуль даволі свабоднай рэалізацыі кантрафактнай прадукцыі на мытнай тэрыторыі Саюза неабходным можна лічыць выкарыстоўванне складанай і шматузроўневай сістэмы мытнай абароны правоў на аб'екты ІУ, якая павінна будзе прадугледзець рэалізацыю трох напрамкаў: павышэнне эфектыўнасці мытнага кантролю шляхам стварэння і выкарыстання адзінай для ўсіх дзяржаў — членаў ЕАЭС сістэмы кіравання рызыкамі, укараненне ўніфікаванай нарматыўнай прававой базы, пашырэнне ўзаемадзеяння ды супрацоўніцтва мытных службаў краін-удзельніц. Праз імклівае развіццё электроннага гандлю і разнастайных тэналогій, у тым ліку, трохмернага друку, істотную важнасць набываюць мерапрыемствы лічбавай трансфармацыі ў сферы ІУ, стварэнне тэхналагічных упаковачных прылад для барацьбы з падробкай, карэктная ідэнтыфікацыя арыгінальных прадуктаў, сумесныя праекты з удзелам суб'ектаў гаспадарання, праваўладальнікаў ды моладзі. Развіццё ІУ абумоўлівае асноўныя шляхі далейшага супрацоўніцтва ды інтэграцыі дзяржаў-членаў, паступова гарманізуецца іх заканадаўства, функцыянуюць наднацыянальныя органы ды ажыццяўляецца пастаянны дыялог паміж органамі дзяржаўнай улады, бізнесам і спажыўцамі для дасягнення агульных мэтаў.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. О Стратегических направлениях развития евразийской экономической интеграции до 2025 г. : решение Высш. Евраз. экон. совета от 11 дек. 2020 г. № 12 [Электронный ресурс] // Евразийская экономическая комиссия. — 14.01.2021. — Режим доступа: http://www.eurasiancommission.org/ru/nae/news/Pages/14-01-2021-1.aspx.. — Дата доступа: 13.09.2023.

2. О некоторых вопросах реализации Договора о товарных знаках, знаках обслуживания и наименованиях мест происхождения товаров ЕАЭС от 3 февр. 2020 г. : решение Совета Евразийской экономической комиссии от 18 мая 2021 г. № 53 [Электронный ресурс] // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. — Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=F92100161. — Дата доступа: 13.09.2023.
3. Макарчук, С. Параллельный импорт и контрафакт: проблемы и методы борьбы / С. Макарчук, Н. Толканица [Электронный ресурс] // Юрист. — 2017. — № 4. — Режим доступа: https://jurist.by/zhurnal/statia/parallelnyj-import-i-kontrafakt-problemy-i-metody-borby. — Дата доступа: 13.09.2023.
4. Соглашение от 29 мая 2019 г. «О механизме прослеживаемости товаров, ввезенных на таможенную территорию ЕАЭС» [Электронный ресурс] // Альта-Софт. — Режим доступа: https://www.alta.ru/tamdoc/19bn0037/. — Дата доступа: 14.09.2023.
5. О прослеживаемости товаров : Указ Президента Респ. Беларусь от 29 дек. 2020 г. № 496 [Электронный ресурс] // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. — Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=P32000496. — Дата доступа: 14.09.2023.
6. О функционировании механизма электронных накладных : постановление Совета Министров Респ. Беларусь от 30 дек. 2019 г. № 940 [Электронный ресурс] // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. — Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C21900940&p1=1. — Дата доступа: 13.09.2023.